

www.ptushki.org | www.birdwatch.by

Птушкі і Мы

№2 (25) 2014

разам для прыроды і людзей

7-10 ТВП

Балота пад грыфам "Сакрэтна"

М. Черкас

21-25 ПРАЕКТЫ АПБ

Нестбоксинг

В. Терешонок

Нашы стракозы (звычайныя віды)

АПБ – гэта не толькі "птушкі". Прапануем паглядзець на разнастайнасць стракоз Беларусі вачыма сяброў нашай арганізацыі Сямена Левага (1) і Дзяніса Кіцеля (2)



Коромысло помесное *(Aeshna mixta)* (1)



Красотка-девушка *(Calopteryx virgo)* (1)



Лютка зеленоватая *(Lestes virens)* (2)



Плосконожка обыкновенная *(Platycnemis pennipes)* (1)



Стрекоза четырехпятнистая *(Libellula quadrimaculata)* (1)



Стрекоза кроваво-красная *(Sympetrum sanguineum)* (1)



Лютка-невеста *(Lestes sponsa)* (2)



Стрелка-девушка *(Coenagrion puella)* (2)



Стрелка изящная *(Ischnura elegans)* (1)



Стрекоза решетчатая *(Orthetrum cancellatum)* (1)



Стрелка красивая *(Coenagrion pulchellum)* (2)



Стрекоза кроваво-красная *(Sympetrum sanguineum)* (1)

Рэдкалегія ПіМа віншуе ўсіх аўтараў і чытачоў з 25-м юбілейным нумарам! Спадзяёмся, што вам цікава з намі!

Каманда ПіМ узору №25 (№2, 2014):


Уладзімір Малашэвіч – галоўны рэдактар


Сяргей Зуенак – адказны рэдактар


Рэдакцыйная рада:


Алег Кальчанка


Алеся Скідан


Аляксандр Вінчэўскі


Аляксей Цішачкін



Віктар Фянчук


Вікторыя Церашонак


Ганна Трафімчук


Мікалай Чэркас

Дызайн і вёрстка


Зміцер Гупянец

Змест



Вокладка:
Сініца-апалоўнік *(Aegithalos caudatus)*
Фота Дзмітрыя Якубовіча

№ 2(25), 2014
Выходзіць з 1999 г.
Перыядычнасць 2 разы на год
наклад 1000 ас.
Рэгістрацыйны №727 ад 12.09.2009 г.
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь
Наш адрас:
ГА "Ахова птушак Бацькаўшчыны",
вул. Парніковая 11, пам. 4, 220114,
Мінск Беларусь
Тэл. (017) 263 01 30, Факс (017) 263 06 13
E-mail: info@ptushki.org
www.ptushki.org

Для карэспандэнцыі
а/с 306, Мінск, 220050, Беларусь

Дзейнасць
ГА "Ахова птушак Бацькаўшчыны"
падтрымліваецца
Каралеўскім таварыствам аховы
птушак (RSPB), партнёрам BirdLife
International у Вялікабрытаніі.
ГА "Ахова птушак Бацькаўшчыны"
з'яўляецца афіцыйным партнёрам
BirdLife International у Беларусі.
Надрукавана ў друкарні ООО «Топпринт».
Ліцэнзія №02330/188 ад 03.04.2009
Замова №







У нумары 1(24) за 2014 год на стр. 19 у навіне пра горную гусь памылкова прыведзена спасылка на сайт www.wildlife.by. Насамрэч першакрыніцай гэтай інфармацыі з'яўляецца сайт www.birdwatch.by. Рэдакцыя прыносіць прабачэнні яго мадэратарам і наведвальнікам.

Кто будет искать индийскую камышевку во времена орнитологического кризиса?

Беседовала Виктория Терешонок
Фото из архивов Василия Гричика



С этим человеком мечтает поговорить, пожалуй, каждый любитель птиц. Где искать овсянку-ремеза, кто пойдет на поиски индийской камышевки и куда деваются вороны из городов? Орнитолог, заместитель декана биологического факультета БГУ, доктор биологических наук Василий Гричик ответит на любой вопрос. О любимом поползне, армии бердвотчеров, орнитологическом кризисе, эволюции студентов, пересмотре систематики птиц и мечтах о Тибете – в большом интервью для «ПіМ».

– Василий Витальевич, Вы тесно сотрудничаете с организацией с момента ее возникновения...

– Практически, да. Но АПБ в 1998 и в 2014 годах нельзя сравнить. Вырос штат. Вырос и объем выполняемых проектов. Сам характер деятельности организации изменился: она стала многонаправленной. Ведь изначально была задача работать на дело охраны птиц, других направлений не было. Это пришло постепенно, эволюционно, и развилось в ту многоотраслевую структуру, которую мы видим сейчас. Хотя и тогда работали на популяризацию знаний о птицах, те же зоочетверги были давно. Но разница очень большая.

– Что можно назвать серьезным достижением организации?

– С первых лет работы АПБ хорошо интегрировалась с государственными природоохранными структурами. И если сначала это было Минприроды, то сейчас список куда шире: около 8 лет сотрудничаем с Министерством образования, немало сделано и с ООН. Без этого успешная работа просто немыслима.

– А будущее? На что следует обратить внимание в природоохранной деятельности и в работе с людьми?

– Не утрачивать занятых позиций. Это очень важно. Есть примеры, когда после расцвета в организацию резко приходит стагнация, работа мельчает. Новые инициативы АПБ говорят о потенциале внутри самой организации. Хороший тому пример – недавний чемпионат по фотографированию птиц. Удачно, блин не комом. Так что, организация может генерировать новые идеи. Если АПБ будет здоровой структурой, эти инициативы сами будут возникать. А что-то менее эффективное уйдет само по себе.

«В АПБ – от школьников до пенсионеров. Это хорошо»

– А люди? В АПБ будут приходить?

– Всегда сложным был вопрос членства. Вряд ли мы достигнем сопоставимых с Великобританией цифр (в Королевском обществе охраны птиц – 1 млн 200 тыс членов – прим.), условия работы и менталитет слишком разные. Но столько и не нужно. А вот то, что в работу вовлекаются разные слои населения – от школьников до пенсионеров, – очень хорошо. Нужно помнить не только о притоке, но и об оттоке членов: люди повзрослели, сменились приоритеты, ротация естественна. Не нужно гнаться за количеством. Если будет много массовых мероприятий, если об АПБ будет говорить пресса – люди придут.

– Почему Вы в АПБ?

– Это случилось в порядке эстафеты. С 80-х годов я был в составе Белорусского орнитологического общества, научной организации. В лихие 90-е она разваливалась, и большинство из нас плавно перетекли в АПБ, организацию с похожими целями и задачами. Мы приняли это как эстафету.

– Вы активно работаете с АПБ и состоите в Совете организации...

– Я уже и не помню, сколько лет! То в Совете, то в ревизионной комиссии. А сейчас у меня созревает новая позиция – пора освежить Совет и вводить туда молодых людей. Мое слово в Совете может принести пользу, но подрастают и набираются опыта другие люди. Хочется внести и их энергию.





«В Налибокской пуще есть над чем работать»

– Есть целый список природных территорий, «раскрученных» с участием АПБ – Туровский луг, Ельня, Званец, Споровский… Какие на данный момент обделенные вниманием ценные природные территории Вы бы могли назвать?

– На мой взгляд, можно уделить больше внимания Налибокской пуще. Это, пожалуй, один из ценнейших лесных массивов в стране, и близкий к Минску. Многое там радует: хорошая микропопуляция волка, рыси, появились медведи. Но есть и проблемы. Границы существующего заказника охватывают территории, части которых не так ценны, как земли с запада, охотничьи хозяйства. В последние годы часто езжу в пущу, там есть над чем работать.

– Спасибо, присмотримся к Налибокской пуще.

– Много и других территорий. Но нужно смотреть на масштаб и степень значимости. Можно работать на уровне региона – например, региональным отделениям АПБ. Еще я вижу вот какую проблему: ООПТ и ТВП выделяются на основе первичных исследований. Позже нужна детализация, уточнение, но до этого зачастую дело не доходит. Это выглядит так: известно несколько ключевых видов, по которым территории выделены как ООПТ и ТВП. Проходят годы, нужно проверять и положение с этими видами, и искать новые. А на это не хватает рук и энергии… Сюда хорошо бы направить волонтерские силы АПБ. Помню, как организация привлекала много людей к учетам вертлявой камышевки. И это дало результат! Под учетом оказались широкие площади, объективно уточнилась численность. Такую практику стоит не забывать и распространять ее на другие виды.

«Что случилось за 20 лет с серой вороной?»

– А на каких птиц стоит внимательнее посмотреть?

– Все виды заслуживают внимания. Я давно озадачен вопросом: что произошло за 20 лет с обычной серой вороной? За пределами городов ее практически нет! В годы моего студенчества это была обычная птица. Иду на практике в Мядельском районе – мог за полдня десяток гнезд осмотреть. А сейчас там нет ворон! При этом самой обычной птицей стал ворон, хотя 30 лет назад это был редкий вид. У врановых явные изменения в сельской местности. Но что произошло – знаем плохо.

– Все больше людей интересуются птицами, список орнитофауны Беларуси пополняется новыми видами. Как Вы считаете, кто может стать следующей находкой?

– Наверняка **овсянка-ремез** уже есть в Беларуси, но пока ее не видели. В Псковской области установлено обитание до самых границ Беларуси. Не может быть, чтобы госграница совпадала с границей обитания вида. Так что, надо витебчанам озаботиться – и тогда в нашей фауне появится этот вид. Дошла до Польши расселяющаяся с востока **индийская камышевка.** Надо научиться отличать ее от близких по песне и по внешнему виду птиц, хорошо посмотреть наши южные рыбхозы – и будет новый для Беларуси вид. Тут упрек в сторону профессиональных орнитологов: почему не ищут? Академики заняты своими проектами, вузовские преподаватели загружены. А вот провести целевую акцию – это идея. Например, **собрать экспедицию на поиски индийской камышевки.** Уверен, люди откликнутся.

«Люди занимаются птицами на уровне «приехал-посмотрел-уехал»

– Как Вам удается совмещать два в одном: работать в университете и оставаться орнитологом? Где черпаете силы?

– Совмещать не удается. Хочется, чтобы везде было идеально, но не хватает времени. С 9 до 16 часов нужно быть на работе. В Налибокскую пущу я могу поехать только на субботу-воскресенье. Благо, есть готовые помочь студенты. Свой отпуск я всегда планирую на апрель-май, самый интересный для орнитолога период. Времени для исследований мало. Для меня мечта – бывать в поле 4 дня в неделю. 3-4 раза в год езжу в Москву в музей МГУ для работы с коллекциями.

– Над чем работаете сейчас?

– Я координирую научную работу всей кафедры. Сейчас много работы ведется по птицам агроландшафтов и рекреационных ландшафтов. Стараюсь не забывать и о своем еще студенческом интересе к Налибокской пуще. Последние 10 лет езжу туда, материал накоплен, вырисовываются интересные вещи, но пока его нигде не публиковал. Бываю на Алтае, недавно опубликовал



Блиц-опрос

Кем Вы хотели быть в детстве?	Юристом. А мысли связать жизнь с зоологией появились в старших классах школы.
Любимая птица?	Поползень. Это крепкий орех для систематиков, интересен в плане изменчивости. И привлекательный для наблюдения, ни секунды не сидит на месте. Порой без улыбки за ним невозможно наблюдать!
Любимое место в Беларуси?	Налибокская пуща. А еще люблю Щару в Ляховичском районе. Давно там не был, нужно съездить.
Какую книгу сейчас читаете?	Дочитываю **«Гении, злодеи, конформисты российской науки»** Симона Шноля, взял у коллег. Детективы и фантастику не читаю. Художественные книги беру только после многих хороших отзывов, наугад не читаю. Из последнего, что оставило глубокий след – **«Каханак вялікай мядзведзіцы»** Сергея Песецкого. Кое-что перечитываю. Например, **«Имя розы»** Умберто Эко. Сейчас стал читать много литературы по **истории Беларуси.** Благо, у нас в Академкниге» бывают хорошие книги.

в журналах Германии и России материалы о птицах Алтая и намерен продолжать. Так что, о птицах не забываю.

– Современные студенты биофака – какие они?

– О тенденциях изменения студентов можно читать целую лекцию! Последние лет 10 я не вижу молодежи (даже среди аспирантов и магистрантов), склонной к глубокой работе с литературой. Орнитология возникла не сегодня и не вчера, занятия наукой требуют серьезного погружения в сделанное предшественниками. Но энтузиазма для работы в поле у молодежи куда больше, чем для литературы. Выехать, посчитать птиц – это сколько угодно, а вот системный анализ уже проблема. Мы живем во времена, когда орнитология переживает своего рода кризис. **Пожалуй, никогда еще птицами не занималось так много людей. И на фоне этого удельный выход полезной с научной точки зрения информации никогда не был таким мизерным. Люди занимаются птицами на уровне «приехал-посмотрел-уехал».** Это не дает материала. Если огромные армии тех же бердвотчеров направить на минимальные исследования – орнитология «зашкалила» бы от новой информации. А пока мало людей делает что-то серьезное, остальные только смотрят на птиц или просто считают уток. А вот пару суток у гнезда посидеть, сделать описания, найти в литературе прежние, сравнить – этим сейчас занимается меньше людей, чем 50 лет назад.

«В Париже не был и не собираюсь»

– Вы часто бываете в командировках. К чему лежит душа?

– Это не командировки, это у меня такой отпуск... Я еду за свой счет и в свое свободное время. Часто бываю на Алтае и хочу съездить еще пару раз. А вот в Париже не был и не собираюсь. Зачем? Памятники можно и в интернете посмотреть. Другое дело – Алтай. Еду в нехоженые места, к границе с Монголией. Там нет следов пребывания человека, ни одной мусоринки. Только это выходит подороже Парижа.

– А есть поездка-мечта?

– Мне очень интересна Центральная Азия. Хочется своими глазами увидеть высокогорный Тибет. Думаю, вряд ли доберусь. Но мечта живет.

– Что можете сказать о журнале «Птушкі і мы» как постоянный читатель и автор?

- Журнал не стал хуже. Он был интересен и 10 лет назад, и сейчас. Видно, что над ним работают. Когда-то я был активным автором, в «Птушкі і мы» вышла серия моих статей об орнитологах середины XIX - XX веков. Так что, желаю новых идей и активных авторов!

– Что в последнее время в литературе о птицах поразило Вас из орнитологических новостей?

– Скажу, что меня пугает. Мне близки по духу и по интересам публикации, основанные на молекулярных методах изучения птиц. Но вот в чем беда: на основе анализов ДНК некоторые горячие головы начинают пересматривать систематику птиц. За 5-6 лет помню несколько таких полусенсационных публикаций, где авторы предлагали поменять систематику песочников, овсянок, цапель, других птиц. Я такие вещи воспринимаю консервативно. Что происходит дальше? Через год-два выходят статьи, что этого делать не следует, что старая систематика ближе к истине, и пошатнувшееся становится на свои места. Не нужно бежать впереди паровоза.

– Что пожелаете начинающим бервотчерам? Подросткам, которые только взяли в руки бинокль?

– Не гоняйтесь за количеством видов. Пусть их будет меньше, но узнавайте больше: как они себя ведут, чем живут. Увидев птицу, не торопитесь опускать бинокль.

БАЛОТА ПАД ГРЫФАМ «САКРЭТНА»

Мікалай Чэркас, кандыдат біялагічных навук

Фота Міхаіла Нікіфарава

Доўгая дарога да балота

Кожнае балота – невядомая планета, на якой марыць пабываць любы даследчык. Альманскія ж балоты – гэта цэлае сузор'е, якое спакон веку прываблівала арнітолагаў. Але трапіць туды яны доўгі час не маглі. У савецкі перыяд на тэрыторыі балот існаваў авіяцыйны палігон "Палескі" (Мерлінскі). З 25 вайсковых палігонаў, якія знаходзіліся на тэрыторыі Беларусі, гэты быў самы буйны, агульная плошча яго складала 127,4 тыс.га. Для параўнання – у той час у БССР не было ніводнай запаведнай прыроднай тэрыторыі, якая б мела такую плошчу. Дарэчы, Альманскія балоты часта ўзгадваліся ў манаграфіях М. С. Долбіка і А. У. Фядзюшына "Птицы Белоруссии" і "Птицы Полесья". Гэтая акалічнасць яшчэ больш інтрыгавала нас і павялічвала наша жаданне трапіць туды.

Амаль па пару разоў на год з Інстытута заалогіі АН у Беларускую ваенную акругу накіроўвалася афіцыйнае пісьмо з запытам дазволіць супрацоўнікам Інстытута даследаваць балотны масіў. Але кожны раз навукоўцы атрымлівалі адмоўны адказ.

Памятаю, як тагачасны намеснік дырэктара М. М. Пікулік, трымаючы чарговую адмову, запытаўся ў старэйшых супрацоўнікаў: "Будзем яшчэ спрабаваць, альбо супакоімся на гэтым?" Усе ў адзін голас адказалі, што трэба і надалей спрабаваць трапіць туды. Між тым сабралася ініцыятыўная група заолагаў, якія вырашылі праплыць вясною па рацэ Сцвіга, якая ўяўляла сабой натуральную мяжу палігона. Але Альманскія балоты і тут не хацелі адкрываць свае таямніцы. Ды й не дзіва – у той час у нас нават мапы добрай не было. Каб толькі паглядзець краем вока 4-кіламетроўкі, неабходны быў спецыяльны дазвол, бо нават такі маштаб ужо меў грыф "Для службовага выкарыстання".

Тым не менш, экспедыцыя ў "terra incognita" адбылася. Адна з начэй прынесла даследчыкам непрыемны сюрпрыз. Была ранняя вясна. Пакуль арнітолагі шукалі соў, сухая трава на выспе, дзе знаходзіўся лагер, загарэлася. Імгненна загарэўся намёт, у якім спаў адзін з удзельнікаў экспедыцыі. Прачнуўшыся ад агню, ён літаральна вынес палаючы намёт са спальнікамі і ўсёй амуніцыяй да старыцы ракі. У ваду трапіла каштоўная фотаапаратура, а ў мітусні пажару згарэлі спальнікі і амаль усе боты.

Але непрыемнасці на гэтым не скончыліся. За навукоўцамі прыехала машына ГАЗ-66, у якую загрузілі байдарку і большую частку рэчаў. Ужо ў поўнай цемры кіроўца вырашыў прагрэць машыну і змяніць месца паркоўкі. Так ужо здарылася, што новае, больш "зручнае" месца аказалася ў самой рацэ. Выконваючы гэты "манёўр", грузавік толькі цудам не перакуліўся, але ж усе рэчы з кузава трапілі ў ваду. Нешта патанула, нешта не без цяжкасцяў удалося вылавіць...



Інфармацыйны шчыт аб узроўню забруджвання радыёнуклідамі ў Кашара-Альманскім лясніцтве. З цягам часу такія падрабязныя стэнды замянілі на простыя знакі радыёактыўнасці. Фота Мікалая Чэркаса (2001 год)



Борці, якія зрабілі на беларускай частцы балота ўкраінскія “парушальнікі мяжы”. Фота Валерыя Дамброўскага



Барадатая кугакаўка – гаспадыня Альманскіх прастораў. Фота Мікалая Чэркаса

Трапіць на Альманскія балоты марыў і я. Маючы дазвол для працы з сакрэтнай літаратурай, у тым ліку і з картаграфічнымі матэрыяламі, я, карыстаючыся выпадкам, вывучыў карту тых мясцін.

Палічыўшы сябе нарэшце падрыхтаванымі, мы вырашылі самастойна прайсці Альманскія балоты.

І вось я з групай аднадумцаў на месцы! Фарсіравалі Сцвігу і рушылі на захад. На нашым шляху пачалі трапляцца карпусы падвясных самалётных бакаў, авіяцыйных ракет і бомбаў. Неўзабаве нізенька над нашымі галавамі праляцелі і самі самалёты. Раптоўна наперадзе пачаліся выбухі, пасля якіх мы вырашылі павярнуць назад.

...Праходзілі гады. Ваенныя таямніцы савецкай імперыі сталі ўжо набыткам гісторыі, а палігон так і заставаўся недасяжным не толькі для нас, але і для іншых даследчыкаў. Што ж, калі нельга прайсці яго па зямлі, то можна паспрабаваць паглядзець балота з паветра. У 1995 годзе навукоўцы здолелі абляцець Альманскія балоты і паглядзець увесь масіў з верталёта. Пабачыўшы сцяжынкі, якія цягнуліся ад вострава да вострава, адзначылі: балота не такое ўжо і непраходнае, як гэта меркавалася раней. Аблёт даў падставу для правядзення далейшых даследаванняў. Са з’яўленнем грамадскай арганізацыі “Ахова птушак Бацькаўшчыны” на Альманскія балоты была арганізавана арніталагічная экспедыцыя, якая адзначыла там на гнездаванні вялікага арляца. Як потым выявілася, тут мае прапіску буйнейшая групоўка гэтага віда ў Еўропе. З цягам часу былі знойдзены і іншыя віды рэдкіх птушак: вяртлявая чаротаўка, барадатая кугакаўка.

Дзякуючы намаганням арнітолагаў быў створаны заказнік “Альманскія балоты”, які ў 1998 годзе быў абвешчаны Тэрыторыяй, важнай для птушак міжнароднага значэння. У 2001 годзе Альманскія балоты атрымалі статус Рамсарскіх угоддзяў.

У 2000 годзе, праз 10 гадоў пасля першай няўдалай спробы пабываць на Альманскіх балотах, я нарэшце здзейсніў сваю мару. Дарэчы, для гэтага прыйшлося звярнуцца “куды трэба” і атрымаць адпаведны дазвол. Але калі мы туды трапілі, на здзіўленне, балота літаральна шумела ад людзей. Тут добра ўжо асвоіліся жыхары прыгранічнай Украіны, якія збіралі на балоце “нашы” журавіны. Цікава, што гэтыя людзі загадзя ведалі пра наш прыезд, але чамусьці лічылі нас лесаўпардкавальнікамі.

Глуханямые загаварылі

Хаця вайскоўцы акупавалі Альманскія балоты яшчэ ў 50-тыя гады мінулага стагоддзя, тым не менш, афіцыйнай датай стварэння палігона лічыцца 1962 год. Мясцовыя казалі, што пры гэтым жыхары Мерленскіх хутароў адмаўляліся перараязджаць з родных мясцін у іншыя куткі краіны. Тады для правядзення “разъяснительной работы”да іх прыехаў генерал. Відаць, не знайшоў ён з хутаранамі агульнай мовы, бо ў запале спрэчак, быццам “па неасцярожнасці”, яны разбілі генеральскую машыну. Вось такой была прыхільнасць палешукоў да здавалася б гіблых месцаў.

Пасля гэтага выпадка адсяленне людзей перайшло ў стадыю поўнамаштабнай вайсковай аперацыі, у выніку якой тэрыторыя цалкам абязлюдзела. Добрую частку балот аддзялілі ад Беларусі і перападпарадкавалі Украінскай ССР. Вялікі абшар быў аддадзены вайскоўцам. Авіяцыя з году ў год у літаральным сэнсе шпігавала яго свінцом і іншымі элементамі табліцы Мендзялеева. Сярод мясцовых жыхароў хадзілі чуткі, што там узрывалі нават ядзерныя боепрыпасы невялікай магутнасці. Але гэта былі толькі чуткі. Падчас перабудовы многія журналісты і навукоўцы спрабавалі знайсці хоць якія-небудзь крыніцы, ў якіх паведамлялася б пра выпрабаванне ядзернай зброі на Палессі. Але ўсё дарэмна.

Прайшоў час. Пасля распаду СССР у СМІ з’явіліся публікацыі аб самых сакрэтных падраздзяленнях вайсковай авіяцыі з вельмі непрыкметнай назвай – рамонтна-тэхнічная база



Адзін з удзельнікаў экспедыцыі доктар біялагічных навук, член-карэспандэнт Акадэміі навук Беларусі М.М. Пікулік



Удзельнікі экспедыцыі праводзяць інвентарызацыю і вырашаюць далейшы лёс уцалелых пасля пажару рэчаў



Вехі нялёгкага шляху да Альманскіх балот



Малочна-цэзіевая карта 1970 г. пацверджвае дачарнобыльскае радыёактыўнае забруджванне Палесся. (Упершыню была апублікаваная Аляксеем Дуброўскім)

(РТБ). Яны ствараліся каля аэрадромаў далёкай авіяцыі. Але менавіта на такіх базах збіраліся ядзерныя бомбы перад загрузкаю іх у самалёт. Тыя, хто служыў у РТБ, былі фантастычна маўклівымі. "Глуханямыя" – так называлі іх у Ваенна-Паветраных Сілах. З цягам часу інфармацыя пра "глуханямых" адкрылася. Ім, дакладней – 12-му Галоўнаму кіраванню Міністэрства абароны СССР, якому падпарадкоўваліся РТБ, прысвечаны падрабязнейшы артыкул у Вікіпедзіі. А ў Інтэрнэце ёсць нават форум самых маўклівых некалі людзей з забаўнай назвай "Глухонемые" ВВС СССР – на связь!" І там яны, намаўчаўшыся за доўгі час, зараз адцягваюцца па поўнай. Вось на гэтым форуме мне і давялося знайсці звесткі аб таямніцах Альманскіх балот. Там жа я знайшоў інфармацыю і аб адной авіяцыйнай частке Балтыйскага флоту, якая дыслакавалася пад Быхавам. Як паведамляюць удзельнікі, зусім недалёка ад горада ў 1957 годзе было пабудавана сховішча РТБ для ядзерных бомбаў. І ўжо к сярэдзіне 1958-га казематы спецаб'екта былі запоўненыя вырабамі, што называецца, "пад завязку". Адны здымаліся з ўзбраення, іншыя паступалі. З гэтай нагоды бомбы першага канструктыўнага тыпу аказаліся самымі "заляжалымі", таму было прынята рашэнне зняць іх з узбраення. Тут, у казематах РТБ, іх і дэмантыравалі. Ядзерны зарад і некаторыя іншыя прылады здымаліся і адпраўляліся назад на завод. Але ж нават і без ядзернага зараду бомба заставалася радыёактыўнай. А вось што з ёю рабіць – вырашыць не маглі.

Як паступілі вайскоўцы? Давайце пачытаем запісы "глуханямога" з форума[1]. Дарэчы, у дзяржаўных СМІ гэты распавед упершыню быў надрукаваны Быхаўскай раённай газетай "Маяк Прыдняпроўя" ад 24.03.2011: *"...Но изделие все равно оставалось источником радиации, поскольку в нем находится несъемный нейтронный источник стабилизации цепной реакции. В августе 1959 года такое изделие подвесили к самолету, который взял курс на юго-запад Беларуси, достиг Столинского военного полигона, где и сбросил эту условную "атомную" бомбу. Над болотами-лесами Полесья поднялся в небо гриб взрыва – без электромагнитного импульса, без мощной ударной волны, яркого светового излучения и вторичной радиации – за исключением рассеивания над полигоном радиации несъемного нейтронного источника... Подобные тренировки экипажей и сборочных бригад проводились еще несколько раз в течение 1959—60-х годов. Вот в чем был секрет "малопонятных" для полешуков испытаний в этом районе. Жившие там люди уже тогда подвергались облучению малыми дозами радиации, платя свою "скромную" цену за размещение на территории республики ядерного арсенала ДКБФ СССР..."*[2].

---

[1] http://www.forumavia.ru/forum/1/3/97361738255471535383511274591 13_17.shtml

[2] http://www.bykhov.by/?p=7302



Застаецца толькі зайздросціць арганізаванасці ўкраінцаў, якія хуценька пабудавалі гаць да месца збору журавін. Фота Івана Багдановіча

Так, амаль больш чым праз стагоддзе, прыадкрылася таямніца Альманскіх балот. Цяжка зараз уявіць, навошта скідвалі гэтыя бомбы на палескія балоты? Што гэта – вялікі эксперымент ці спрошчаная "утылізацыя"? Так альбо інакш, у пачатку 60-х гадоў на Палессі пачала працаваць навуковая экспедыцыя, якая вывучала радыяцыйную сітуацыю ў гэтым краі. Праца працягвалася некалькі год. Як сцвярджаюць крыніцы, маштабы даследаванняў па некаторых кірунках пераўзыходзілі нават паслячарнобыльскія. Прапанова навукоўцаў была вельмі цікавай. Каб спыніць міграцыю радыёактыўных рэчываў на Палессі, трэба было правесці меліярацыю і ўносіць на палеткі ўгнаенні. Фактычна гэтыя даследаванні і падштурхнулі ўлады да правядзення буйнамаштабнай меліярацыі Палескай нізіны. Ужо у 1966 годзе Пленум ЦК КПСС вынес вердыкт: асушыць на беларускім Палессі 2,7 млн. гектараў балот. Але ў гэтыя мільёны гектар Альманскія балоты, дзякуючы вайсковаму палігону, не трапілі і засталіся некранутымі.

"Майдан" на балоце

Пасля распаду СССР палігон стаў выкарыстоўваца не так інтэнсіўна. Надзвычай хутка знайшлі яму прымяненне гра-



Гэтая бомба так і не ўзарвалася. На Альманскіх балотах такіх "падарункаў" ад вайсковай авіацыіі СССР засталося яшчэ шмат. Фота Мікалая Чэркаса



Адзін з бункераў пад Быхавам, дзе збіраліся бомбы, якія былі потым скінуты на Альманскія балоты. Фота Мікалая Чэркаса

мадзяне Украіны. Балотныя абшары з'яўляюца сапраўдным журавінным царствам, скарбамі якога і карыстаюца суседзі. Яны наладзілі збор журавін і іншых ягад і грыбоў. У час збору журавін на балотах стваралiся лагеры, ў якіх жыло да 1000 і болей чалавек. Таму не выпадкова беларускія памежнікі забаранілі перасячэнне мяжы не ў пунктах пропуску. Але ж нелегальнае перасячэнне мяжы, браканьерства, высечка дрэў у буйных маштабах, пажары – вось далека не поўны пералік парушэнняў, якія тварылі на Альманскіх балотах украінцы. Не прыпыніла ініцыятыўных суседзяў і дэпартацыя. Толькі за 2010 г. з тэрыторыі Беларусі было выдварана 3040 грамадзян Украіны. Сітуацыя рэзка пагоршылася пасля таго, як 2 ліпеня 2011 года каля 120 украінцаў сабралася каля пункту пропуску "Мутвіца" і запатрабавалі дазволіць ім збор ягад і грыбоў на беларускай тэрыторыі, а таксама адпусціць раней затрыманых грамадзян.

Гэта беспрэцэдэнтны выпадак у гісторыі органаў памежнай службы Беларусі. Таму для стабілізацыі становішча ў рэгіёне і ў мэтах пазбягання масавага парушэння дзяржаўнай мяжы, кажучы мовай афіцыйнага дакумента, паміж урадамі Беларусі і Украіны дасягнута пагадненне аб сезонным пропуску грамадзян для збору грыбоў і ягад. Самае масавае "паломніцтва" назіраецца, натуральна, падчас паспявання журавін. Аб маштабах нагрузкі на балота можна меркаваць па колькасці наведвальнікаў. Паводле інфармацыі начальніка аддзела памежнай службы штаба Луцкага пагранічнага атрада Івана Чаплінскага, у 2012 г. на трох пунктах спрошчанага пераходу, створаных на ўскраіне балота, было зарэгістравана... 83000 (!) перасячэнняў мяжы жыхарамі 10 прыгранічных вёсак. Па ацэнках спецыялістаў, сума эканамічнай страты, якая наносіцца Беларусі грамадзянамі Украіны за кошт збору журавін, можа складаць ад 4 да 7 млн. даляраў ЗША.

У цяперашні час на "здароўі" Альманскіх балот адмоўна адбілася і будаўніцтва дарогі, якая перасякае ўвесь масіў з поўначы на поўдзень.

Тым не менш, заказнік "Альманскія балоты" дае прытулак такім рэдкім птушкам, як вялікі арлец і арол-вужаед. Агульная колькасць вялікага арляца ў межах заказніка складае 18-20 гняздуючых пар. Для параўнання, ва ўсім Еўрасаюзе ў цяперашні час ад сілы набярэцца 10 пар гэтых птушак.

Спадабаліся Альманскія балоты і барадатай кугакаўцы. Хоць яна і аддае перавагу паўночным прасторам, але ўжо вельмі да душы прыйшліся ёй Альманскія балоты. Іх абшары забяспечваюць існаванне значнай часткі (10-20%) беларускай папуляцыі гэтай рэдкай савы, якая прадстаўлена, мяркуючы па ўсім, ізаляванай рэліктавай групоўкай на поўдні Беларусі і крайняй поўначы Украіны.

Добра сябе адчувалі тут і арлы-вужаеды да тарфяных пажараў 2002 года, калі агульная іх колькасць на тэрыторыі заказніка складала каля 30 пар. Пасля пажару адбылося катастрафічнае зніжэнне шчыльнасці гнездавання гэтага віду. Толькі цяпер, больш як праз 10 гадоў, папуляцыя пачынае павалі аднаўляцца.

З-за вялікай працягласці і цяжкадаступнасці тэрыторыі, адсутнасці населеных пунктаў на Альманскіх балотах змаглі захавацца непарушанымі тыповыя для рэгіёну фаўністычныя комплексы. Найбольш вывучана зараз арнітафаўна заказніка "Альманскія балоты", якая ўключае 189 відаў птушак, з якіх 131 пэўна гняздуецца, для 9 гнездаванне толькі мяркуецца, а яшчэ 49 відаў сустракаюцца толькі падчас сезонных міграцый, на зімоўцы, або з'яўляюцца выпадкова залётнымі. Са складу гняздуючых відаў 22 занесены ў Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь, два з іх (вялікі арлец і вяртлявая чаротаўка) з'яўляюцца глабальна пагражаемымі – для захавання гэтага багацця на тэрыторыі Альманскіх балот неабходна стварыць запаведнік, і рабіць гэта трэба неадкладна, пакуль яшчэ не позна.

Пугачы

Алег Кальчанка, Кобрын
Фота аўтара

Малады пугач, 2012 год

За гэтай парай пугачоў я назіраю ўжо пяць гадоў. Першыя тры гады я толькі слухаў птушак, вызначаў, дзе яны трымаюцца. Проста наведваў гэтае месца ў сакавіку – красавіку, а часам і ў лютым, і слухаў. Птушкі заўсёды былі на адным і тым жа месцы. Лес зусім не тыповы для гэтай савы: даволі сухі, пераважна сасновы. Толькі бліжэй да невялічкай рачулкі ён пераходзіў ў вольхава-бярозавы, але ўсё роўна такі, дзе магчыма прайсці нават у красоўках. Зусім недалёка ад гнездавога ўчастка праходзіць дарога, таму ў пэўныя часы тут бывае даволі "людна". Словам, усё не "як у сапраўдных пугачоў", што толькі павялічвала маё жаданне пазнаёміцца з гэтай парай бліжэй. Звычайна гэтыя совы жывуць у месцах, дзе людзі бываюць рэдка. Гэта часткова залітыя вадой алешнікі, астравы на балотах і іншыя месцы, не вельмі прывабныя для чалавека. Яйкі адкладваюць на зямлі, альбо ў старых гнёздах буйных птушак, пераважна драпежных. Калі знойдзецца вялікае дупло, дзе зможа жыць пугачыная сям'я, птушанят будуць гадаваць там. Пара, за якой я назіраў, адклала яйкі на зямлі, гэта нармальна. А вось прысутнасць чалавека іх шмат гадоў не бянтэжыла, яны заўсёды бачылі людзей, і па некалькі разоў за дзень. Больш за тое, людзі праходзілі часам у трыццаці метрах ад гнязда. Таму мая прысутнасць каля гнязда ўсяго два разы на сезон не магла выклікаць негатыўных наступстваў.

2012 год.

Першы раз я пачуў пугача ў сакавіку: самец актыўна выдаваў сваё "у-ху", якое разносілася на некалькі кіламетраў. Пашукаць гнездавы ўчастак у гэты раз неяк не атрымалася, і да траўня я не ведаў, што тут і як. Але як толькі я зноў апынуўся ў гэтых месцах, мяне як магнітам пацягнула ў лес, дзе пару месяцаў таму я чуў вялікіх соў.

Пра травеньскі лес ведаюць усе: спяваюць птушкі, адчуваецца пах раслін, што і казаць – цудоўная пара. Вось недзе ў кронах спявае авяльга, далей выдаюць свае рулады чорны дрозд, пячураўкі, сініцы, дзятлы... Не спяшаюся, да цемры далёка, планую яшчэ крыху пахадзіць. Акрамя іншых птушак чую берасцянку. Не, не спеў. Птушка падае голас трывогі – пэўна, бачыць небяспеку. Хто гэта? Драпежная птушка, куніца? Разумеючы, што гэта не я спалохаў птушак, накіроўваюся ў гэтым напрамку. І вось каля сасны бачу нешта белае і, здаецца, жывое. Першыя імгненні не веру сваім вачам. Але ўсё ж так і ёсць: каля дрэва сядзяць, прытуліўшыся адзін да аднаго, птушаняты пугача! Падымаю да вачэй бінокль і пачынаю іх разглядаць. Птушанят тры, два буйнейшыя па баках і адзін, самы малы – пасярэдзіне. Цяпер разумею, чаму берасцянкі так сябе паводзілі. Яны бачылі дарослую птушку, якая сядзела побач з птушанятамі і зляцела з гнязда з маім набліжэннем. Хутка падыходжу да птушанят, раблю фота. Малыя сядзяць спакойна, зрэдку старэйшы



Гняздо пугача з птушанятамі, 2012 год

шчоўкае дзюбай. Вакол гнязда раскіданы рэшткі ахвяр, якія трапілі ў кіпцюры дарослых. Тут бачу пёры маладога крумкача, канюха-мышалова, выплюйкі з рэшткамі нейкай мышынай дробязі. Дарослай птушкі ў гэты раз я так і не заўвыжыў, сустрэча з ёй адбудзецца потым, пад час кальцавання малых.

Каля гнязда, каб не вельмі турбаваць птушак, я затрымаўся не болей пяці – шасці хвілін, няхай і дарослыя, і маладыя супакояцца. Праз пару тыдняў будзем спрабаваць кальцаваць. 7-га чэрвеня, увечары, я прыехаў сюды зноў з мэтай знайсці і акальцаваць птушанят. На гадзінніку 18.30, пачынаю пошукі. Гняздо, як і мусіць быць, пустое. Птушаняты соў пакідаюць гняздо, яшчэ не ўмеючы лётаць, але яшчэ доўгі час знаходзяцца ў яго наваколлі. Пугачы не выключэнне. Раблю невялікія кругі, каб не прапусціць птушаня. Першага знайшоў хутка – малы сядзіць метрах у трыццаці ад гнязда. Часу мала, неабходна хуценька кальцаваць, што і раблю; малады пугач рэагуе на працэдуру спакойна, разыходзімся з мірам. Пачынаю пошукі астатніх. Хаджу ўжо амаль гадзіну, птушанят не бачу, а вось дарослыя здзівілі. Першым падае голас самец. Яго гучнае "у-ух" раздаецца даволі далёка, можа дзе за кіламетр. Амаль адразу за гэтым, не вытрымаўшы, з'яўляецца самка. Для пугача гэта вельмі нетыпова: птушка аблятае мяне, зрэдку пакрыквае характэрным "ке-ке" і, што самае цікавае, садзіцца на сасну метрах у трыццаці ад мяне. Я яе добра бачу. Для некаторых іншых вялікіх соў гэта тыповая сітуацыя, яны нават і атакуюць чалавека, а вось пугач звычайна адлятае ад гнязда і на вочы не паказваецца. А тут такое!!!

Але дзе ж іншыя птушаняты? А, вось і другі! Ён, як і папярэдні, сядзіць, літаральна зліўшыся з сасной, што робіць яго амаль непрыкметным. Зразумеўшы, што яго рассакрэцілі, малы вырашыў змяніць тактыку: смешна раскрыў крылы і пабег да бліжэйшага хмызняку. Хутка даганяю і лаўлю. Гэты вядзе сябе зусім па-іншаму – ляпае дзюбай і мусіць вырвацца. Кальцую і яго. Самка па-ранейшаму лётае навокал і трывожна пакрыквае. Трэцяга, на жаль, так і не знайшоў. Можа, што здарылася з ім, а можа, хочацца верыць, ён проста не трапіў мне на вочы. Усё, справа зроблена. Спадзяюся, што і з малымі, і з дарослымі ўсё будзе добра. У верасні, падчас спаборніцтваў па спартыўнай арніталогіі, мы бачылі пугача ў гэтым месцы. Але хто гэта быў, малады ці дарослы, не даведаемся ніколі. Гэта і не важна, галоўнае, каб птушкі жылі...

2013 год.


Птушак зноў пачуў у сакавіку, першы раз 8-га чысла, калі ўжо было цёмна. Дакладней, не птушак, а птушку: самец гучна падаваў свой далёка чутны голас. Самка, мяркую, была недзе недалёка. Магчыма, ўжо і адклала першае яйка. Птушкі зноў прытрымліваліся гэтай тэрыторыі, якую займалі ўжо як мінімум 4 гады. Гэта задавальняла – праз два месяцы можна будзе зноў шукаць птушанят. Зразумела, што так я і зрабіў.

1 траўня.

Паехаў пад вечар, травеньскі лес сустрэў мяне цэлым наборам добра знаёмых гукаў: спяваюць шматлікія вераб'іныя, недзе крычыць жаўна, над лесам падаў голас канюх-мышалоў. Спакойна вядуць сябе лясныя жыхары, быццам і няма тут грознага драпежніка, які з надыходам ночы будзе наводзіць жах на ўсё жывое. Адразу іду на тое месца, дзе ў мінулым годзе знайшоў гняздо. Вось і яно, вакол гнездавой ямкі яшчэ можна заўважыць рэшткі ахвяр, пераважна пёры птушак. Ведаючы пра гнездавы кансерватызм пугача, я ўпэўнены на сто атсоткаў, што новае гняздо недзе побач. Трэба толькі пашукаць. Амаль адразу чую трывожныя галасы берасцянак. "Пінь-пінь" – гэта, безумоўна, не ў мой адрас. А вось і голас пугача. Гэта самка. Яна, як і летась, падае характэрны менавіта для яе гук: "ке-кек". Іду на гукі і бачу птушку. Яна сядзіць на сасне і пасля некалькіх маіх крокаў пералятае далей. Але ўсё роўна не знікае, а ўвесь час знаходзіцца побач. Гэта, безумоўна, тая самая птушка, што і ў мінулым годзе. Паводзіны тыя ж, зусім не ха-




Звычайная чачотка
(Carduelis flammea)
Звычайны зімуючы і транзітна мігрыруючы від



Рагаты жаўрук
(Eremophila alpestris)
Нешматлікі мігрыруючы і нерэгулярна зімуючы від



Сняжурка *(Plectrophenax nivalis)*
Нешматлікі мігрыруючы і нерэгулярна зімуючы ў цэнтральнай і паўднёвай частцы Беларусі від




Попельная чачотка
(Carduelis hornemanni)
Рэдкі зімуючы від



Жаўрук-смяцюх
(Galerida cristata)
Рэдкі аселы від, у зімовы час трымаецца ў населеных пунктах і становіцца больш прыкметным



Снежны падарожнік
(Calcarius lapponicus)
Вельмі рэдкі залётны падчас міграцыі від



Горная чачотка
(Carduelis flavirostris)
Рэдкі зімуючы від



Горная пліска *(Motacilla cinerea)*
Вельмі рэдкі залётны падчас міграцыі від



Горны свірстун
(Anthus spinoletta)
Рэдкі зімуючы від


АПБ

ВУШАТАЯ САВА – птушка 2015 года

	Студзень January	Люты February	Сакавік March	Красавік April	Травень May	Чэрвень June
Пн /Mon	5 12 19 26	2 9 16 23	2 9 16 23 30	6 13 20 27	4 11 18 25	1 8 15 22 29
Ат /Tue	6 13 20 27	3 10 17 24	3 10 17 24 31	7 14 21 28	5 12 19 26	2 9 16 23 30
Ср /Wed	7 14 21 28	4 11 18 25	4 11 18 25	1 8 15 22 29	6 13 20 27	3 10 17 24
Чц /Thu	1 8 15 22 29	5 12 19 26	5 12 19 26	2 9 16 23 30	7 14 21 28	4 11 18 25
Пт /Fri	2 9 16 23 30	6 13 20 27	6 13 20 27	3 10 17 24	1 8 15 22 29	5 12 19 26
Сб /Sat	3 10 17 24 31	7 14 21 28	7 14 21 28	4 11 18 25	2 9 16 23 30	6 13 20 27
Нд /Sun	4 11 18 25	1 8 15 22	1 8 15 22 29	5 12 19 26	3 10 17 24 31	7 14 21 28

	Ліпень July	Жнівень August	Верасень September	Кастрычнік October	Лістапад November	Снежань December
Пн /Mon	6 13 20 27	3 10 17 24 31	7 14 21 28	5 12 19 26	2 9 16 23 30	7 14 21 28
